УДК 811.161.3’42’367.325:821.161.3-343.4*А. Масла

**А. Д. Цапалава**
Навуковы кіраўнік – **Н. П. Цімашэнка**,
канд. філал. навук, дацэнт

# ВЫРАЖЭННЕ АТРЫБУТЫЎНЫХ АДНОСІН НА ЎЗРОЎНІ СКЛАДАНАГА СКАЗА Ў МОВЕ КАЗАК АЛЕНЫ МАСЛА

**Анатацыя.** Аўтар артыкула вызначае актыўнасць ужывання ў казачных творах Алены Масла складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі адносінамі; вылучае тыпы азначальных частак з улікам іх дадатковай семантыкі.

**Ключавыя словы:** сінтаксічная канструкцыя, семантыка, сінтаксіс, атрыбут, значэнне атрыбутыўнасці, складаназалежны сказ, атрыбутыўныя адносіны.

Сучасная лінгвістычная літаратура пры разглядванні складаназалежнага сказа закранае шэраг пытанняў, якія звязаны з рознымі характарыстыкамі сказа як асноўнай адзінкі сінтаксісу. Адны з гэтых пытанняў шырока асветлены ў сучаснай навуцы, іншыя патрабуюць больш дэталёвай распрацоўкі.

Сярод складаназалежных сказаў адно з самых значных месцаў у сучаснай беларускай мове займаюць сказы з азначальнымі даданымі. Гэтыя сказы як адзін з асноўных сродкаў характарыстыкі прадметаў дазваляюць з вялікай дакладнасцю і паўнатой раскрыць іх прыметы, якасці, уласцівасці і тым самым стварыць вобразнае і канкрэтнае ўяўленне аб прадметах. Такія сінтаксічныя канструкцыі вельмі часта выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры. Гэта пацвярджаецца творчасцю сучаснай беларускай пісьменніцы Алены Масла, казкі якой карыстаюцца вялікім попытам у чытачоў усіх узростаў. Творы гэтай пісьменніцы часта маюць у сваім складзе складаназалежныя сказы нерасчлянёнай структуры. Найбольш частотнымі з’яўляюцца складаназалежныя сказы з атрыбутыўнымі адносінамі.

Актуальнасць дадзенай работы вызначаецца актыўным ужываннем разглядаемых сінтаксічных канструкцый як у сучаснай беларускай мастацкай прозе, так і ў даследчых лінгвістычных працах. Найбольш значнай у гэтым аспекце лічыцца дысертацыя Н. А. Несцеравай «Градуальность в сложноподчиненных предложениях с атрибутивно-выделительными придаточными» [1]. Але ў дадзенай рабоце не разглядаецца выкарыстанне такіх канструкцый у мастацкай прозе.

Важным з’яўляецца і пытанне аб самой атрыбутыўнасці, паколькі гэта паняцце семантычнае. Як вядома, атрыбутыўныя адносіны – гэта адносіны паміж прадметам і яго прыкметай, якія знаходзяць сваё адлюстраванне ў словазлучэнні паміж яго кампанентамі альбо ў складаназалежным сказе паміж азначальным словам і азначэннем у выглядзе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

даданай прэдыкатыўнай часткі. Калі немагчыма адназначна вызначыць тып сувязі паміж адзінкамі словазлучэння ці сказа, навукоўцы вылучаюць змешаныя тыпы сувязі. Такая з’ява носіць назву “кантамінацыя сінтаксічных адносін, ці кантамінацыя сінтаксічнай семантыкі кампанентаў сказа” [2, с. 2]. Рэгулярна сустракаюцца наступныя кантамінаваныя значэнні кампанентаў сказа: аб'ектна-атрыбутыўныя і аб'ектна-акалічнасныя.

Складаназалежныя сказы з атрыбутыўнымі даданымі валодаюць шэрагам прыкмет, якія характэрны для складанага сказа: наяўнасць злучальных слоў, якія аб'ядноўваюць часткі складаназалежнага сказа, парадак пабудовы сказа, інтанацыйная завершанасць. У мастацкіх творах Алены Масла можна вылучыць наступныя формы складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі даданымі часткамі: складаназалежныя сказы з даданымі, якія выражаюць атрыбутыўна-пашыральныя адносіны, і складаназалежныя сказы з даданымі, якія выражаюць атрыбутыўна-вылучальныя адносіны.

Найбольш частотнай групай складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі даданымі ў мове казак Алены Масла з’яўляюцца сказы з даданымі, якія выражаюць атрыбутыўна-пашыральныя адносіны. Змест такіх канструкцый заключаецца ў тым, што даданая частка, якая фармальна залежыць ад назоўніка ў галоўнай частцы, змяшчае звесткі аб пэўным прадмеце ці асобе. Даданая частка ў дадзеным выпадку далучаецца пры дапамозе злучальнага слова *які, чый, каторы, што.* Такія даданыя служаць не для вылучэння прадмета ці асобы з шэрагу аднародных, а для надання новых звестак аб гэтым прадмеце ці асобе: *На ёй пабудаваны дамы, у якіх мы жывём...* [3, с. 13]; *Грэбліва крывіліся прыгажуні, да якіх вецер даносіў словы дуба* [3, с. 17]*; Але сярод іх быў толькі адзін удзячны госць, які не забываў і прывітацца і на расстанне рукой махнуць* [3, с. 32]. З прыведзеных прыкладаў бачна, што назоўнік, які знаходзіцца ў галоўнай частцы, не патрабуе тлумачэння, а даданая частка разглядаецца як дадатковае далучанае значэнне. Дадзены тып складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі адносінамі сустракаецца найбольш часта, паколькі выкарыстанне такіх канструкцый паказвае аўтарскае майстэрства стылістычна правільна выражаць свае думкі ў мастацкім тэксце.

Пры разгляданні складаназалежных сказаў з даданымі, якія адлюстроўваюць атрыбутыўна-вылучальныя адносіны, можна адзначыць, што ў такіх сказах даданая частка можа пашыраць назоўнік (ці займеннік) у спалучэнні з займеннікам *той*, які часцей за ўсё адсутнічае і маецца на ўвазе: *Гэта быў той пераапрануты чараўнік, у якога гаспадар калісьці і набыў казачнае дрэўца* [3, с. 13]*; Вераб’ям, якія без справы таўкліся па двары, Вецер загадаў узяць у дзюбы сушэйшай травы і адпаліраваць на гронках рабіны ягады* [3, с. 9]. Варта адзначыць, што ўказальны займеннік *той* выконвае ролю вылучальнай часціцы, а даданая частка дапасуецца да галоўнай з дапамогай злучальных слоў *які, чый*. Даданая



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

частка дазваляе вылучыць прадмет ці асобу, аб якой гаворыцца ў галоўнай частцы, з шэрагу аднародных. Гэты тып сказаў можна аднесці да так званых асноўных канструкцый, якія паказваюць атрыбутыўна-вылучальныя адносіны і павялічваюць ролю прадмета ў выказванні.

Складаназалежны сказ з атрыбутыўнымі даданымі часткамі можа ўключаць ў структуру галоўнай часткі займеннік *такі*, які мае даданае вылучальна-якаснае значэнне, а даданая частка далучаецца да галоўнай пры дапамозе злучальнага слова *каторы*: *Але Пых не згадзілася, ёй карцела самой саткаць такі дыван, пра каторы гаварыла б усё наваколле* [3, с. 23]. Але больш часта ў мове казак Алены Масла можна сустрэць сказы, якія маюць у даданай частцы займеннік *каторы* і не маюць ніякага слова ў галоўнай частцы, якое б паказвала на вылучальна-якаснае значэнне. У такіх сказах слова *каторы* можна замяніць на займеннік *які* без страты атрыбутыўных адценняў: *Быў сярод іх і ўрач, каторы лячыў добрага чалавека* [3, с. 34]*; Во ўжо будзе пацехі лесунам і балотным вадзянікам, перад каторымі яна свой шляхетны носік задзірала!* [3, с. 42]; *Дзяўчынку, пра каторую мы хочам расказаць, у Шчаслівай Даліне вучылі іграць на жалейцы* [3, с. 62]. У дадзеным выпадку слова *каторы* выкарыстоўваецца як запазычаная замена з рускай мовы традыцыйнаму займенніку *які.*

Калі да назоўніка ў галоўнай частцы дапасавана азначэнне, тады можна казаць аб тым, што даданая частка адносіцца да цэлага словазлучэння: *Ён раззлаваўся на марнасць сваіх старанняў і паляцеў назад, у горад, да бальнічнага акна, на якім спадзяваўся знайсці хлебных крошак* [3, с. 33]*; З цікавасцю слухала расказы маці пра сваіх родзічаў, якіх яшчэ мала ведала: пра навальнічныя хмары, начныя і ранішнія* [3, с. 20].

Разглядаючы складаназалежныя сказы з атрыбутыўнымі даданымі, мы заўважылі, што сустракаюцца сказы, даданыя часткі якіх у пэўным кантэксце набываюць дадатковыя адценні часу, прасторы, далучальнасці, тлумачальнасці і г. д. У такіх выпадках ствараецца “двухслаёвая семантыка”: атрыбутыўна-часавая, атрыбутыўна-прасторавая, атрыбутыўна-далучальная і г. д. [4, с. 35]. Адной з найбольш частотных груп сказаў з двухслаёвай семантыкай у мове казак Алены Масла з’яўляецца група складаназалежных сказаў, у якіх даданая частка змяшчае выказванне, што дапамагае чытачу вылучыць прамежак часу, тэрмін дзеяння і г. д., і далучаецца злучальнымі словамі *калі*, *пакуль,* якія выказваюць атрыбутыўна-часавыя адносіны: *Так, як і тым пагожым ранкам, калі казачнік лугам ішоў* [3, с. 4]*; У тую ж ноч асядлаў ён любімага гаспадарскага коніка і ганяў да той пары, пакуль той з ног не збіўся* [3, с. 42]. Сустракаюцца сказы, якія дадаюць атрыбутыўна-вылучальным адносінам адценні месца. Часцей за ўсё даданая частка далучаецца ў такіх сказах пры дапамозе злучальнага слова *адкуль*. У такіх складаназалежных сказах з атрыбутыўнымі даданымі можна, акрамя пытання *які?,* паставіць дадатковае пытанне *дзе?* Напрыклад: *І хутка той край, адкуль саслалі яго сюды, на ласкавы, але далёкі поўдзень, заквітнее казкамі* [3, с. 14]*; Тады*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Анёл стаў заглядваць ва ўсе вокны, адкуль струменіўся свет ад чыстых душ, нядаўніх жыхароў Чароўнай Краіны* [3, с. 64]. Зрэдку ў мове казак Алены Масла сустракаюцца сказы, якія маюць атрыбутыўна-вылучальныя адносіны з адценнем меры і ступені. Часцей за ўсё такія складаназалежныя сказы маюць даданыя, якія далучаюцца з дапамогай злучальнага слова *што*: *Ён надзьмуўся і дыхнуў на старога з-пад вугла такім холадам, што той акалеў уміг* [3, с. 9].

Такім чынам, даследаванне складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі даданымі ў сучаснай мастацкай літаратуры на прыкладзе казак Алены Масла дазволіла вылучыць асноўныя мадэлі такіх сінтаксічных канструкцый, якія назіраюцца ў мове яе твораў, прааналізаваць структурныя кампаненты, якія ўдзельнічаюць у структуры і семантыцы выказвання. У тэкстах казак Алены Масла шырока прадстаўлены канструкцыі складаназалежных сказаў з атрыбутыўнымі адносінамі. Найбольш частотнымі з'яўляюцца сказы з азначальнымі часткамі, якія выражаюць атрыбутыўна-пашыральныя адносіны. Даданыя часткі ў такіх сказах далучаюцца пры дапамозе слоў *які, чый, каторы, што*. Часта сустракаюцца таксама сінтаксічныя канструкцыі з даданымі, якія выражаюць атрыбутыўна-вылучальныя адносіны, далучаюцца пры дапамозе слоў *які, каторы* і маюць указальны займеннік *той* у галоўнай частцы. Такія сказы дапамагаюць прыцягнуць увагу чытача, сканцэнтраваць яго на пэўных момантах зместу, дадаць аўтарскія меркаванні. Наяўнасць разглядаемых сінтаксічных канструкцый адпавядае стылю мастацкага тэксту, дадае пэўную інтанацыйную структуру тэксту і, нарэшце, актуалізуе ўспрыняцце казак чытачамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нестерова, Н. А. Градуальность в сложноподчиненных предложениях с атрибутивно-выделительными придаточными : дис. … канд. филол. наук / Н. А. Нестерова. – Саранск, 2005. – 172 с.

2. Пекарская, И. В. Конструкции синтаксической контаминации как экспрессивное средство современного русского языка (на материале художественных и публицистических текстов) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / И. В. Пекарская. – Красноярск, 1995. – 16 с.

3. Масла, А. Таямніца закінутай хаты / Алена Масла. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 68 с.

4. Устинов, А. М. Синтаксическая семантика сложноподчиненного предложения / А. М. Устинов. – Иваново : Ивановский государственный университет, 1967. – 68 с.

**Abstract.** The author of the article reveals the active use of complex sentences with attributive relations in Elena Masla's tales; identifies the types of attributive clauses considering their additional semantics.

**Keywords:** syntactic structure, semantics, syntax, attribute, value of attributiveness, complex sentence, attributive relations.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ